Адрозніць канфесіянал ад кабінета псіхолага

Аўтар: Арцём Ткачук
20.02.2022 00:00



Споведзь – гэта адзін з моцных асацыятыўных каталіцкіх сімвалаў. Сцэны з канфесіяналам сустракаюцца і ў камедыях, і ў баевіках. Разам з тым споведзь застаецца адным з найбольш практычных сакрамантаў. Не толькі таму што св. Камунія патрабуе пакаяння, але і з-за бясконцых праблем, траўм і пошуку спагады ды міласэрнасці. Размаўляем з экзарцыстам пра споведзь, мяжу псіхалагічных і духоўных праблем. **–** ***Чым споведзь адрозніваецца ад сеанса ў псіхолага ці псіхатэрапеўта?***

– Споведзь – гэта сакрамант, у якім чалавек можа атрымаць адпушчэнне грахоў. Акрамя таго, што ёсць нейкія грахі, асоба прыходзіць да споведзі са сваімі духоўнымі ці жыццёвымі праблемамі. Спаведнік дае парады, слухае чалавека. Калі ж бачны нейкія псіхічныя ці псіхалагічныя праблемы, то святар можа скіраваць асобу да іншага спецыяліста. Вось тут і праходзіць мяжа.

– У Вашай практыцы былі выпадкі, калі чалавек прыходзіў да споведзі, а Вы накіроўвалі яго да псіхолага? Без адпушчэння грахоў з-за адсутнасці да гэтага падставы.

– У маёй практыцы не здаралася такога, што чалавек спавядаецца, але ў яго не грахі, а нейкія захворванні. Бываюць памежныя выпадкі: асоба ўсведамляе грахі і нясе за іх адказнасць, але мае таксама дадатковыя псіхалагічныя праблемы. Тады раю звярнуцца да псіхолага. Выпадкаў чыста клінічных захворванняў у маіх пэнітэнтаў не было.

Адрозніць канфесіянал ад кабінета псіхолага

Аўтар: Арцём Ткачук
20.02.2022 00:00

